растения или его частей, т. е. внешние особенности, вкус, запах, токсичность, жгучесть, лечебные свойства, использование в магических обрядах и т. д.

Рассмотрим некоторые примеры.

Например, ядовитость растений отражена в таких народных названиях как колокольчики смерти (наперстянка крупноцветная); сонная одурь, бешеная вишня (красавка обыкновенная); мышьяк, пьяна трава (термопсис ланцетный,); бешеная трава (белена), болотная одурь (багульник болотный) и т. д.

Лилию в травниках называли «одолень-травой». Считалось, что она отпугивала нечистую силу. Высушенный корень лилии носили как оберег.

Зверобой народные врачеватели называли «травой от девяноста девяти болезней» и считали, что без него невозможно вылечить многие тяжелые болезни, его также использовали как кровоостанавливающее средство.

Крапиву в некоторых местностях называют жгучка, жигала, кострыка, стрекучка, стрекава, жалива. А валериана имеет, наверное, самое большое количество народных названий: лесная заря, мяун, аверьян, веснушка, домобыльник, козья борода, кошачья трава и т. д. Таким образом, одно и то же растение может иметь несколько народных имен, отражающих чаще сходные, но нередко и совершенно различные его особенности.

***Заключение***

В результате анализа некоторых русских фитонимов были выявлены следующие мотивационные признаки, лежащие в основе их номинации: большое число названий растений связаны с мифологией, морфологией растений, местом обитания, их лечебными свойствами.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. *Ожегов, С. И.* Толковый словарь русского языка : более 100 000 слов, терминов и фразеологических выражений / С. И. Ожегов; под ред. проф. Л. И. Скворцова. — 28-е изд., перераб. — М.: Мир и образование, 2018. — 1376 с.

2. Греческо-русский словарь / сост. А. Д. Вейсман. — М., 1991. — 1371.

3. *Коляда, А. С.* О чем говорят названия растений? Происхождение русских названий растений Дальнего Востока России / А. С. Коляда, О. В. Храпко, Н. А. Коляда. — Владивосток: БСИ ДВО РАН, 2009. — 215 с.

4. *Кун, Н. А.* Легенды и мифы древней Греции / Н. А. Кун. — Минск: Народная асвета, 1989. — 463 с.

**УДК 908(476.2 – 21 Мозырь)**

## МАЗЫР — “ЖАМЧУЖЫНА ПАЛЕССЯ” (ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ ЭКСКУРС)

***Бароўская І. А.***

**Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Уводзіны***

Наш край надзвычай багаты на творчыя здабыткі, на шчырых, добрых, таленавітых і вельмі працавітых людзей. Нездарма сёлетныя Дажынкі праводзяцца менавіта ў горадзе над Прыпяццю. Мазыр здаўна меў гістарычнае і культурнае значэнне, таму і трапляе ён у поле зроку гісторыкаў і аматараў літаратурна-песеннага слова.

***Мэта***

Раскрыць некаторыя моманты з гісторыі і культурнай (песенна-літаратурнай) традыцыі Мазыра.

***Метады даследвання***

Даследчы, апісальны, аналітычны.

***Вынікі даследвання і іх абмеркаванне***

Яшчэ старажытнагрэчаскі гісторык і этнограф Герадот, распавядаючы пра паход персідскага цара Дарыя на скіфаў (513 г. да н.э.), згадваў іх паўночных суседзяў — неўраў, што жылі ў басейне ракі Прыпяць: “*Гэтыя людзі, відаць, чарадзеі. Скіфы, а*

*таксама эліны, якія жывуць сярод іх, па меншай меры сцвярджаюць, што кожны неўр адзін раз у год на некалькі дзён ператвараецца ў ваўка, а потым зноў прымае чалавечы выгляд*” [1, с. 213]. Першае ўзгадванне Мазыра адбылося ў “Аповесці мінулых гадоў” (Іпацеўскі летапіс), дзе апісваўся факт перадачы горада ў 1155 годзе кіеўскім князем Юрыем Далгарукім чарнігаўскаму князю Святаславу Ольгавічу. У 30–40 гадах XVI стагоддзя на Мазыршчыне пабываў беларускі шляхціч Міхалон Літвін, які пазней у дыдактычным трактаце “Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян” (1550 г.) так перадае свае ўражанні: “*Многія рэкі называюцца залатымі, асабліва Прыпяць, якая ў адным месцы, паблізу ад Мазыра… напаўняецца такой колькасцю рыбы, што кінутае ў яе кап’ё, затрымліваецца і стаіць стырчком, нібы ўторкнутае ў зямлю, … адтуль чэрпалі рыбу і за адзін дзень напаўнялі ёй тысячы вазоў, што належаць купцам*” [2, с. 8].

На працягу доўгага часу горад знаходзіўся ў цэнтры набегаў крымскіх і нагайскіх татараў, перажыў бунт амбіцыйнага князя Міхаіла Глінскага, вайну з Маскоўскай дзяржавай, крывавае паўстанне ўкраінскіх казакаў, якое было жорстка задушана князем Радзівілам Янушам. Вядомы таксама гістарычныя факты, якія гавораць аб непакорнасці і незалежнасці жыхароў Мазыршчыны. Так, падчас Люблінскай уніі, Мазырскі павятовы сейм шляхты прыняў рашэнне не пераходзіць разам з астатнімі паветамі Кіеўскага ваяводства пад апеку Кароны Польскай, а застацца ў складзе Вялікага княства Літоўскага [3, с. 9]. У сатырычным творы XVII стагоддзя “Прамова Мялешкі” невядомага аўтара, галоўны герой Іван Мялешка, які сапраўды быў паслом ад Мазырскага павета ў 1589 годзе на сталічным шляхецкім сейме, выказаў патрыятычныя ідэі, выкрыў тых, хто ў пагоні за багаццем і ўладай, адрокся роднай зямлі і радзімы: “*Много тутако таких ест, што хоць наша костка, однак собачим мясом обросла и воняет*” [3, с. 9].

“Ліст да Абуховіча”, мазырскі спіс “Александрыі”, Ян Чачот “Спевы пра даўніх ліцьвінаў да 1434 года”, пісьменнік-падарожнік XIX стагоддзя Павел Шпілеўскі і яго нарысы “Падарожжа па Палессі і Беларускім краі” і “Мазыршчына”. У прадмове да зборніка вершаў “Дудка беларуская” Францішак Багушэвіч піша выказванне, якое сцвярджае ідэю адзінства свету Беларусі ў дачыненні да нацыянальнага мастацтва слова: “*Можа хто спытае — гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчак і вёсак…*” [4, с. 17].

Але Мазыршчына славіцца не толькі гістарычнай спадчынай, багатая яна і на песні. Цікавы і складаны шлях прайшла песня з часоў свайго зараджэння. Непасрэдна паэтыкай народнай песні абумоўлена структура, вобразна-выяўленчыя сродкі і мастацка-стылёвыя прыёмы першых беларускіх песенных твораў. Мяняліся ідэі, тэмы, накірункі, пашыралася іх жанрава-стылёвая разнастайнасць. Намі заўважана пэўная колькасць песень, прысвечаных менавіта славутаму гораду. Адным з вядомых паэтаў, які праслаўляў гэты горад, быў Уладзімір Верамейчык. Уся спадчына паэта — гэта гімн Мазыру, Прыпяці, Палессю. Гімн узнёслы, велічны, урачысты, як сам горад. Гімн, які спявае чалавек, што добра ведае гэты сусвет і цудоўна разумее сутнасць радаснага і прыгожага ў жыцці на гэтай зямлі, дзе ўсё спалучылася, з’ядналася ў нешта адзінае, непадзельнае, дарагое: *Мазырскі мілы край I ты з узнятаю рукой Мая любоў I мой адчай* (“Мазыранка”). Лірыка песняра Палесся шматстайная, політэматычная, шматвобразная, якая нагадвае не адзін інструмент, а шматгалосы хор. Як сапраўдны рэквіем гучаць у ім згадкі пра страшэнную вайну, якая забрала жыццё ягонага бацькі, а кастлявы голад амаль не забраў яго самога. І толькі клопаты бабулі дазволілі маленькаму хлапчуку вярнуцца да жыцця. Словамі лірычнага героя паэт перадае моцнае жаданне беларускіх салдат убачыць жытнія палі, родныя хаты і краявіды, але знявечанай паўстала перад імі Беларусь: *I з-пад рукі пабачылі*



Репозиторий ГомГМУ

*байцы Закатаваных у дварах ля ганкаў І жудасныя печы ў Трасцянцы* ("Беларускія франты"). Раскрыццю ідэйнага зместу садзейнічае адметная фанетычная арганізацыя твора, якая дапамагае падкрэсліць, вылучыць асобныя словы, звярнуць на іх асаблівую ўвагу, узмацніць інтэнсіўнасць дзеяння. Паэт выкарыстоўвае ў радку параўнанне-метафару, спалучэнні слоў, заснаваныя на метафарычных і метанімічных пераносах значэнняў, якія ствараюць жудасны малюнак тых часоў (*дзе чырванеў крывёю гарызонт…*). Для найбольшага эмацыянальнага ўздзеяння Ул. Верамейчык скарыстоўвае антытэзу, заснаваную на супастаўленні процілеглых паняццяў, што дазваляе усебакова апісаць малюнак тых жудасных падзей (*І дзень і ноч наперад! Справа, злева…*). Увогуле, метафара ў творчасці паэта выступае крыніцай узбагачэння і развіцця мовы, мастацкай творчасці, у песенных радках выконвае вобразатворчыя функцыі (выступае ва ўсіх тропах) і служыць для канкрэтызацыі ўяўлення, рытарычнай мэце і, урэшце, сімвалізацыі, яе мэтазгоднасць і мастацкая задума, звычайна выяўляецца ў кантэксце. У песеннай лірыцы адчуваецца выразная пераклічка з фальклорнай традыцыяй. Іншы раз нават не зусім прыкметная, не на ўзроўні запазычанняў, а ўнутраная, генетычная, што больш важна і істотна за вобразна-тэматычныя супадзенні. Вобразна-выяўленчая сістэма песенных твораў Ул. Верамейчыка не гоніцца за яркай, вонкавай абалонкай, а канцэнтруе вакол сябе дадатковыя штрыхі, дэталі, параўнанні. Усё гэта разам сведчыць аб вялікім майстэрстве паэта, яго здольнасці знаходзіць адпаведныя вобразна-выяўленчыя сродкі для выказвання стану душы, якая імкнецца спяваць.

Але не толькі Ул. Верамейчык праславіў г. Мазыр у песеннай творчасці. Складзена ўжо пэўная традыцыя паэтычнага ўслаўлення Палесся і любага горада. Спакойна і велічна, як плынь Прыпяці, прагучала песня "Беларусь мая" (словы А. Русака, музыка В. Серабранікава), у стылі масавай традыцыйнай песні вытрыманы твор "Ля Прыпяці" (словы А. Бароўскага, музыка В. Серабранікава). Паэтычна-песеннае ўслаўленне мясцовай прыгажуні выразна ўвасоблена ў песні "Дзяўчыначка-мазыраначка" (словы Г. Манкевіча, музыка В. Серабранікава). Паэтычным прызнаннем у любові да роднага краю становяцца песні Івана Казелькі на словы мазырскага паэта А. Малюка "Радзіма", "Успаміны", "Чэрвеньскія ночы". Кампазітар настолькі ўлюбёны ў родны край, што піша ў тэмпе вальса песню "Палеская лірычная" (словы Б. Сармонта), а прызнанне ў любові да роднага горада так і называе – "Мозырский вальс" (словы А. Садохі), а для песні "Мозырь" піша тэкст разам з вядомым паэтам Б. Спрынчанам. У гэтым шэрагу і песня "Мазырская быліна" на словы Я. Мацюшэнкі, дзе горад як быццам выйшаў з казкі. Галоўнай рацэ Палесся будзе прысвечана песня І. Казелькі "Припять-матушка". У песні "Мозырская лирическая", дзе словы і музыка таксама напісаны Іванам Мікітавічам, ён з упэўненасцю палешука ўсклікае: "*Но не променяю наш холмистый Мозырь На туманный Лондон, даже на Париж*".

Вельмі мала гарадоў Беларусі і свету, якія могуць пахваліцца такой колькасцю песень. А колькі іх створана апошнім часам! Напрыклад, зборнікі "Песні роднага краю", "Песні для дзяцей" і іншыя.

***Заключэнне***

Песні роднага краю… Яны ўзнёслыя і лірычныя, жартоўныя і патрыятычныя, вясёлыя і сумныя. Чалавек не можа без песні, як не можа без неба і сонца. Людзі спявалі, калі нараджаўся чалавек, калі нараджалася маладая сям'я, у песні тапілі свой адчай і гора, скруху і безвыходнасць. Мазыршчына – гераічны край з глыбокай гісторыяй і таленавітымі людзьмі, край песенны і багаты на цудоўныя мелодыі.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Геродот, История в девяти книгах. — Л.: Наука, 1972. — 600 с.
2. Цыт. па кн.: Мазыр. 850 год: у 3 т.; Т. 2. Мазыр літаратурны / І. Ф. Штэйнер [і інш.]; пад аг. рэд. праф. І. Ф. Штэйнера. — Гомель: КВПУП "Сож", 2005. — 216 с.
3. *Кошман, П. Р.* Мазыр у люстэрку старадаўніх літаратурных традыцый. / Мазыр. 850 год : У 3 т. Т. 2. Мазыр літаратурны / І. Ф. Штэйнер [і інш.]; пад аг. рэд. праф. І. Ф. Штэйнера. — Гомель : КВПУП "Сож", 2005. — 216 с.
4. *Багушэвіч, Ф.* Творы: Вершы, паэмы, апавяданні, артыкулы, лісты./ Ф. Багушэвіч — Мінск, Мастацкая літаратура, 1991. — 296 с.




Репозиторий ГомГМУ